*Дзяніс Дук*

## АРХЕАЛАГІЧНЫЯ РАСКОПКІ І НАГЛЯД ЗА БУДАЎНІЧЫМІ РАБОТАМІ У ПОЛАЦКУ

Летам 2005 г. праводзіліся будаўнічыя работы па ўзвядзенню новага корпуса Белдзяржстраха па вул. Камуністычная, 4 у г. Полацку. Тэрыторыя, адведзеная пад будаўніцтва, уваходзіць у межы ахоўнай зоны культурнага пласта, таму існавала аб'ектыўная запатрабаванасць у правядзенні экстраных выратавальных раскопак перад пачаткам будаўніцтва. Археалагічныя раскопкі праводзіліся сіламі студэнтаў-гісторыкаў 1—4 курсаў УА "Полацкі дзяржаўны універсітэт". Агульнае кіраўніцтва ажыццяўляў загадчык кафедры гісторыі і сацыялогіі, кандыдат гістарычных навук Дук Дз.У. на падставе дазвола № 1606 па форме № 1, выдадзенага інстытутам гісторыі НАН Беларусі.

На тэрыторыі будаўнічага катлавана плошчай каля 230 кв. м быў разбіты раскоп 1 (168 кв. м). На астатняй частцы будаўніага катлавана ажыццяўляўся археалагічны нагляд, паколькі тут праводзіліся экстраныя будаўнічыя работы. Культурны пласт у раскопе I мае магутнасць каля 3 м.

У раскопе I былі выяўлены рэшткі ювелірнай майстэрні першай паловы XVII ст. Уражвае асартымент вырабаў з бронзавага сплава, якія належалі да прадукцыі ювелірнай майстэрні. Усяго знойдзена 96 гатовых вырабаў і нарыхтовак (дэталі касцюма, упрыгожванні, утылітарныя вырабы). Папярэдне вызначаны хімічны склад металу — гэта бронзавы сплаў на аснове медзі з невялікімі дамешкамі срэбра*. Усе рэчы мясцовай вытворчасці, аб чым сведчыць вялікая колькасць кавалкаў і цэлых тыгляў, знойдзеных разам з рэчамі (50 адзінак).

У раскопе I знойдзена вялікая колькасць вырабаў XI—XIX стст. З найбольш рэдкіх адзначым цалкам функцыянальную кулялейку, 3 касцяныя шахматныя фігуры (ферзь, ладдзя і пешка (?)). Унікальным з'яўляецца стыло XI—XII стст., зробленае з рогу. Сярод знаходак вылучаецца абсалютны рарытэт — віслая свінцовая пячаць з выявай Маці Божай Знаменне і ініцыяламі МР (аверс) і надпісам "СЕРА ИМС" (Серафім) (рэверс) (ф. 1). Верагодна, пячаць належала епіскапу, не выключана яе мясцовае паходжанне.

Археалагічныя раскопкі ў Спаса-Праабражэнскай царкве Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра ў г. Полацку праводзіліся ў лістападзе 2005 г. Мэта раскопак: вызначэнне характару і структуры культурнага пласта склепаў Спаскай царквы, і, адпаведна, прызначэння саміх склепаў. Работы праводзіліся ў межах рэспубліканскай комплекснай праграмы аднаўлення і рэканструкцыі помніка архітэктуры XII ст. — Спаса-Праабражэнскай царквы.

Унутры царквы (у падцаркоўі) размешчана 9 склепаў агульнай плошчай 33,3 кв. м. Склепы розныя па памерах і плошчы, аднак, як высветлілася ў працэсе раскопак, зроблены ў адзін час (другая палова XVIII ст.). Раскопкі праводзіліся ў 8 склепах. Склепы прызначаліся для пахавання памерлых. Чалавечыя рэшткі зафіксаваны ў склепах 1—3. Косткі пакладзены ў драўляныя труны, пры гэтым анатамічны парадак іх размяшчэння парушаны. Культурны пласт па магутнасці не аднолькавы ў розных склепах (ад 0,1 да 1,5 м), утварыўся пласт падчас будаўніцтва склепаў. Усе пахаванні зроблены ў культурным пласце, моцна папсаваным скарбашукальнікамі.

Усяго былі выяўлены рэшткі не менш за 30 чалавек рознага ўзросту, з іх 5 дзяцей (антрапалагічная экспертыза праведзена В.А. Емяльянчык). Археалагічныя знаходкі нешматлікія і даюць уяўленне аб часе будаўніцтва склепаў.

Археалагічны нагляд у 2005 г. праводзіўся на аб'екце будаўніцтва жылога дома па вул. Леніна 29 (тэрыторыя Вялікага пасада). Культурны пласт мае магутнасць ад 1,4 да 4 м. Адкрыты рэшткі пахаванняў, якія датуюцца XI—XII стст. Па трасе траншэі пад каналізацыю ўскрыты падмурак былога эканамічнага дома Багаяўленскага манастыра (помнік архітэктуры XVIII ст.).

Такім чынам, раскопкі ў Полацку ў 2005 г. прынеслі каштоўныя вынікі, з якіх асабліва варта адзначыць адкрыццё чарговай, пятай з вядомых у Полацку XI—XVIII стст., ювелірнай майстэрні.



*Фота 1. Віслая свінцовая пячаць*

*Хімічны аналіз праведзены ў лабараторыі кафедры хіміі Полацкага дзяржаўнага універсітэта.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова